ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
Іўеўскага райвыканкама
А.Б.Цысар

**Інструкцыя**
аб раённым конкурсе
на лепшае мерапрыемства
па фарміраванню культуры сямейнага дасуга
"Сям'я – аснова патрыятычнага выхавання асобы"

## 1. Агульныя палажэнні

Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раеннага конкурсу на лепшае мерапрыемства па фарміраванню культуры сямейнага дасуга "Сям'я – аснова патрыятычнага выхавання асобы" (далей - конкурс).

Конкурс, прысвячаецца Году якасці, праводзіцца ў рамках выканання ў Іўеўскім раёне Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2021–2025 гады, падпраграмы "Маладзёжная палітыка" Дзяржаўнай праграмы "Адукацыя і маладзёжная палітыка" на 2021–2025 гады з мэтай актывізацыі работы клубных устаноў па забяспячэнню змястоўнага сямейнага дасуга, садзейнічання ўмацаванню ідэй патрыятызму ў семях.

## 2. Асноўныя задачы конкурсу

- умацаванне сувязей паміж пакаленнямі, умацаванне цікавасці бацькоў і дзяцей да патрыятычнай тэматыкі;
- фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі членаў сем'яў, гонару за сваю краіну, свой народ, паважлівых адносін да палітыкі сваёй дзяржавы, фарміраванне жадання працаваць на карысць сваёй краіны, свайго народа;
- фарміраванне глыбокай павагі да нацыянальнай спадчыны, традыцый і звычаяў свайго народа;
- выхаванне павагі да нацыянальных герояў, знакамітых землякоў, людзей, якія праславілі нашу Радзіму, фарміраванне пачуцця гонару за іх дасягненні;
- фарміраванне паважлівага стаўлення да гісторыі і культуры роднага краю;
- стварэнне ўмоў для рэалізацыі творчай актыўнасці сем'яў ў напрамку патрыятычнага выхавання;